

*Камайскі касцёл Яна Хрысціцеля.*

**КАМА́ЙСКІ КАСЦЁЛ Я́НА ХРЫСЦІ́ЦЕЛЯ**, помнік абарончага дойлідства ў в. Камаі Пастаўскага р-на. Пабудаваны ў 1603—06 з цэглы. Моцна пацярпеў у вайну Расіі з Рэччу Паспалітай 1654—67, калі ў час пажару абваліліся цагляныя скляпенні. Пры аднаўленні касцёла іх замянілі драўлянымі. У 18 ст. дабудавана капліца з крыптай. Падчас Паўн. вайны (1700—21) храм быў атакаваны і абстраляны з гармат шведамі. Рэканструяваны ў 1861. Стылявое аблічча касцёла сінтэзуе рысы готыкі і рэнесансу. Першапачаткова храм уяўляў сабой 3-нефавую базіліку, цяпер — аднанефавы. Неф касцёла перакрыты люстраным драўляным скляпеннем, капліца — цыліндрычным, у апсідзе захаваліся крыжовае і зорчатае скляпенні. Архіт.-прасторавая кампазіцыя будынка вырашана асн. прамавугольным у плане аб'ёмам, завершаным паўкруглай апсідай, сакрысціяй і 2 магутнымі цыліндрычнымі вежамі (выш. 16 м, дыяметрам 5 м) на гал. фасадзе. Скляпенні распісаны ў тэхніцы грызайль. Асн. аб'ём і капліца накрыты 2-схільным дахам. Гал. фасад прарэзаны глыбокімі арачнымі нішамі і аконнымі праёмамі, вежы — байніцамі-люкарнамі і высокімі вузкімі вокнамі. У інтэр'еры 4 барочныя драўляныя алтары 18 ст. Цэнтр. 2-ярусны, з калонамі карынфскага ордара, аздоблены драўлянымі скульпт. абразамі апосталаў Пятра і Паўла, у цэнтры — абраз «Маці Божая з немаўляткам» у сярэбраным чаканым абкладзе 17 ст. Захаваўся драўляны разны арган 18 ст. На тэр. храма, абнесенай агароджай з бутавага каменю, устаноўлены звон (2003), адліты ў гонар 400-годдзя Камайскай парафіі Св. Яна Хрысціцеля і 25-годдзя пантыфіката Папы Рымскага Яна Паўла II.

На адлегласці 30 м ад касцёла ўстаноўлены Камайскі лацінскі крыж — помнік гісторыі 15—16 ст. (выш. 2,5 м, шыр. гарызантальнай папярэчыны 1,88 м), высечаны з ружовага гранітнага валуна. Вертыкальная частка яго мае форму звужанай угору трапецыі. У сяродкрыжжы зроблена трохвугольная ніша для распяцця, пад ёй высечаны 4 рады знакаў, яшчэ ніжэй — знак у выглядзе парасона (круг дыяметрам каля 9 см). На тыльным і часткова фасадным баках нанесены больш познія надпісы лац. шрыфтам (не расшыфраваны). Храм унесены ў Дзярж. спіс гісторыка-культ. каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Касцёл дзейнічае.

*Ю.Ю.Захарына.*



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ